**Духоўная культура беларускага народа як умова фарміравання моўнай асобы замежнага навучэнца**

Г.Басава /Йенскі універсітэт, Германія/

Гісторыя – „рака часоў“, дзе ў бясконцай зменлівасці інтэрпрэтацый і вобразаў размываюцца зыходныя контуры з’явы, а разам з тым – і яе непасрэдная індывідуальнасць. Належаць да гісторыі ў тым сэнсе, каб выступіць/ выявіць сябе/ у сваёй зыходнай непаўторнай значнасці /пэўнасці/, на сваім месцы, значыць раскрыцца ў пэўным “тут і зараз” і не знікнуць у хуткай зменлівасці ўспрымання / Г.С.Кнабе/. Сусвет уяўляе сістэму, якая складаецца з мноства падсістэм: Сусвет у цэлым і кожная яго падсістэма з’яўляюцца жывымі і самаарганізаванымі. Кожны народ – жывая сістэма, якая знаходзіцца ў развіцці і з’яўляецца часткай агульнай сістэмы чалавецтва.

Духоўная культура кожнага народа – унікальная, паколькі фарміруецца ў спецыфічных, толькі ёй уласцівых умовах. Феномен культуры “пранізвае ўсе галоўныя падзеі жыцця і свядомасць людзей нашага часу” і вызначаецца як

1. норма зносін людзей розных культур, форма дыялогу;
2. як механізм самадэтэрмінацыі асобы, з уласцівай для яе гістарычнасцю і сацыяльнасцю;
3. як форма ўспрымання “свету ўпершыню”.

Гэтыя тры азначэнні ўзаемазвязаныя і ўзаемаабумоўленыя. Разам з тым культуру можна разглядаць як форму адначасовага быцця і зносін паміж людзьмі розных часоў і эпох. У культуры чалавек як бы зноў і зноў спасцігае Сусвет, асэнсоўваючы яго ўласна для сябе, інтэрыярызуючы, пераводзячы яго ва ўнутраны план, прысвойваючы яго. Гэта азначае, што ў аснове ідэі культуры – дыялог, што азначае зносіны ў культуры, дыялог розных культур. Сапраўдны дыялог паміж культурамі стаў магчымы толькі ў XX ст., калі чалавек пачаў нібы замыкаць на сабе культуру, уступаючы ў зносіны з людзьмі розных краін і эпох.Гэты этап у развіцці чалавецтва В.І.Вернадскі назваў ноосферай і звязаў з фарміраваннем планетарнай свядомасці. У гэтым адрозненне чалавека нашай эпохі ад чалавека папярэдніх эпох, які выбіраў і абсалютызаваў адзін тып паводзін, адзін тып культуры. Да ідэі планетарнай свядомасці чалавека XX і XXI стагоддзяў узыходзіць уяўленне аб агульначалавечым характары сучаснай цывілізацыі, аб гуманітарным мысленні, якое прадугледжвае свабоднае перамяшчэнне ў культурах.

Працэс збліжэння людзей, краін суадносіцца не з усебаковым вывучэннем і засваеннем чужых культур, а з павагай да іх, што, у сваю чаргу, патрабуе пэўнага іх ведання. Таму культура краіны вывучаемай мовы, культура яго народа ад традыцыйнага прывітання, мімікі і рухаў і да “самых тонкіх спосабаў мыслення” /Ю.Хабермас/ павінна быць абавязковай у выкладанні замежнай мовы, паколькі, каб уступіць у зносіны, недастаткова ведаць мову, неабходна ведаць як ёй карыстацца ў пэўным сацыяльным кантэксце. Таму знаёмства з культурай краіны вывучаемай мовы і яе носьбітамі з’яўляецца абавязковым кампанентам у вывучэнні замежнай мовы на ўсіх узроўнях навучання. Гэта патрабуе пошуку такіх метадаў і прыёмаў працы, якія б, па магчымасці, эксплікавалі б агульнанацыянальную культуру з яе традыцыямі, эстэтычнымі і маральна-этычнымі каштоўнасцямі, нацыянальным светаўспрыманнем і светабачаннем, з культурна-гістарычнымі асацыяцыямі і г.д.Так, вывучэнне беларускай мовы замежнымі студэнтамі з Германіі, Італіі, Бельгіі, В’етнама ў Йенскім і Лейпцыгскім універсітэтах патрабуе ўліку эксплікатнай выхаваўчай задачы – арганізацыі базавага мінімуму, асновы культурнай кампетэнцыі, каб прывіць замежным студэнтам павагу да беларускай культуры, яе разуменне.Бо, як вядома, зразумець сваю культуру можна толькі асэнсаваўшы іншую, і, вывучаючы замежную мову, навучэнец выступае не пасіўным рэцыпіентам, а асобай з засвоенай сістэмай этнасацыяльных каштоўнасцей. Інтэграцыя беларускай культуры ў працэсе выкладання беларускай мовы праводзіцца: 1/ праз авалоданне замежнымі навучэнцамі афіцыйнай, ці “класічнай”культуры беларусаў; 2/ праз тлумачэнне і разуменне імі традыцый і звычаяў беларускага народа; 3/ праз асаблівасці духоўнага выхавання на Беларусі ў адпаведнасці з чым і вызначаюцца пэўныя задачы ўспрымання гэтай інфармацыі.

Паколькі кожнаму народу ўласцівы свой “вобраз свету”, ёсць і ў беларускай культуры асаблівасці, звязаныя з беларускім менталітэтам, які тлумачыцца/звязаны з прыналежнасцю беларусаў да пэўнага культурна-гістарычнага арэалу, геаграфічнай і гістарычнай прасторы. І ўваходжанне ў беларускі “свет культуры”, удзел у дыялогу культур замежнымі студэнтамі магчымы толькі пры ўмове разумення імі кодаў беларускай культуры, якія вызначаюцца “нацыянальным вобразам свету”, нацыянальным складам псіхікі, мыслення, геаграфічным становішчам Беларусі. Культура чалавецтва не ведае абсалютна непаўторных кодаў, але своеасаблівыя несуадпаведнасці, несупадзенні тых ці іншых культурных рэалій –лакуны- заўсёды выяўляюцца ў працэсе міжкультурнай камунікацыі. Пераадолець гэтыя складанасці

дапамагаюць разнастайныя гісторыка-культурныя і этнаграфічныя каментары.

Самым фундаментальным сінтэзам як у нашай гісторыі, так і ў гісторыі ўсходніх славян, з'яуляецца сінтэз славянскага язычніцтва і хрысціянскай этыкі. Сутыкненне язычніцкага і хрысціянскага стварае "дыялектыку чалавека" і тую дваістасць нацыянальнага характару, якая ніколі не знікае. У выніку дыялогу дзвюх прынцыпова рознахарактарных культур / адвечнай, ідучай ад вытокаў нашага этнасу, ад каранёў нашага радаводу, і больш позняй па часе ўзнікнення і пашырэння на нашых землях культуры хрысціянскай/ спрацаваў феномен беларускай ментальнасці: народ не адцураўся сваёй, спрадвечнай духоўнай спадчыны, але адначасова даверыўся і прыняў чужое, сілай навязанае. Думаецца, галоўнай асаблівасцю сімбіёзу дзвюх традыцый было тое, што фундаментам, асновай засталося старое, а новае было пераасэнсавана і адаптавана праз прызму гэтага ж старога. Гэтыя звесткі – базавы культурны фонд, неабходны для пранікнення ў духоўную культуру беларускага народа.

Такім чынам, беларуская культура - гэта сукупнасць матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, створаных беларускім народам у мінулым і сучасным на побытавым, мастацкім, навуковым і духоўным узроўні, народам, які мае агульную гісторыю, мову і рысы нацыянальнага характару. Нацыянальная культура ствараецца народам праз нацыянальную свядомасць, што ўсталёўваецца і мацуецца на аснове нацыянальнага характару, нацыянальнай мовы і нацыянальнай гісторыі. Беларуская культура з'яўляецца споведдзю жыцця беларусаў і займае пачэснае месца ў агульнасусветным кантэксце. Сапраўдныя міжкультурныя зносіны магчымы толькі пры ўмове ўсведамлення адрозненняў і захавання не толькі сваіх, але і іншакультурных адметнасцей і асаблівасцей.

## ЛІТАРАТУРА

1. Бахтин М.М. Эстетика словесного творчества.- М., 1979.
2. Библер В.С. От наукоучения – к логике культуры: Два философских введения в двадцать первый век.- М., 1990.
3. Доманский В.А. Культурологический подход к изучению литературы.// Вестник Томского государственного университета, т.266, 1998.
4. Колесов В.В. Жизнь происходит от слова...- С.Пб., 1999.
5. Крук Я. Сімволіка беларускай народнай культуры.- Мн., 2000.